Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 САКАВІКА 2019 г. СУБОТА № 42 (28909)

# ШЧЫРАЯ РАЗМОВА АБ НАШЫМ ЖЫЦЦІ

**Менавіта так можна, без перабольшання, назваць фармат дыялогу Прэзідэнта нашай краіны з журналістамі, прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці і экспертамі, які доўжыўся ўчора ў адміністрацыйным будынку на праспекце Пераможцаў больш за сем гадзін. «Вялікая размова з Прэзідэнтам» сабрала больш за дзвесце ўдзельнікаў, пытанні задаваліся і ў жывым, і ў інтэрактыўным фармаце. Гаварылі аб усім: аб незалежнасці, аб бяспецы, аб палітыцы, аб бізнесе, аб зарплатах і пенсіях, аб жыллі, аб адукацыі, аб мове, аб спорце, аб музыцы, аб жанчынах... Здаецца, падчас гутаркі не засталося без увагі ніводнай актуальнай тэмы.**

**Нашы карэспандэнты працавалі непасрэдна на месцы важнай падзеі і падрыхтавалі для чытачоў «Звязды» падрабязную справаздачу аб ёй.**

ISSN 1990 - 763X

**Аляксандр Лукашэнка павітаў прадстаўнікоў беларускіх і замежных СМІ і экспертнай супольнасці і звярнуў увагу на тое, што ў размове належыць даць аб'ектыўную ацэнку ў адносінах да самых гучных тэм, якія асабліва хвалююць грамадства. Паводле яго слоў, усё, што прагучыць у зале, стане асновай для падрыхтоўкі важнай для краіны падзеі — штогадовага Пасланння Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту.**

**Прэзідэнт падкрэсліў, што, нягледзячы на моцнае развіццё медыйнай прасторы, зараз адчуваецца дэфіцыт кантэнту, які карыстаўся б абсалютным даверам аўдыторыі. Адна з прычын — так званыя фэйкавыя навіны, лічыць кіраўнік дзяржавы. «Яны імгненна распаўсюджваюцца, захопліваюць аўдыторыю, бударажаць думкі. Потым, вядома, абвяргаюцца, але градус напружання ў грамадстве не падае, — сказаў ён. — І вы ведаеце, што там, дзе размова ідзе пра вялікую палітыку, небяспека ад падобнага роду інфармацыйных укідаў павялічваецца шматразова».**

**Роля фактару, які стрымлівае, або процівагі тут дадзена аўтарытэтным выданням і журналістам, якія яшчэ выконваюць законы прафесійнай этыкі і нормы маралі, паважаюць сваю аўдыторыю і імкнуцца ў сваёй рабоце да дакладнасці і максімальнай аб'ектыўнасці. Такіх, праўда, застаецца ўсё менш, але яны ў нас ёсць, сказаў Прэзідэнт. «Вельмі хацелася б, каб і СМІ, якія пазіцыянуюць сябе як незалежныя, і эксперты, якія ацэньваюць падзеі і ствараюць пэўны фон іх успрымання, адчувалі мяжу дапушчальнага. Мяжу, за якой парушаецца раўнавага ў грамадстве. Разумелі адказнасць за кожнае сказанае слова. Таму што мір і парадак у краіне не вартыя прафесійных амбіцый», — выказаў сваю думку Аляксандр Лукашэнка, настройваючы прысутных такім чынам на канструктыўны дыялог.**

## Аб Саюзнай дзяржаве і незалежнасці

Адказваючы на пытанне ад прадстаўніка радыёстанцыі «Говорит Москва», Прэзідэнт чарговы раз падкрэсліў, што Беларусі і Расіі наканавана быць разам. «Нават калі наш старэйшы брат, ну, не вельмі такі-сякі і гэтак далей. Ну, братоў жа не выбіраюць. І ў нас мора недахопаў. Мы таксама не заўсёды, ведаеце, пушыстыя і беленькія. Таму гэта жыццё, да гэтага трэба спакойна ставіцца, але мы павінны быць разам», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Фота БелТА.

Ён вітаў рост увагі расійскага кіраўніцтва да лёсу Саюзнай дзяржавы: «Нарэшце вы ўбачылі саюзны праект, нарэшце вы хвалявацца пачалі і нарэшце вы заклапаціліся Саюзнай дзяржавай». Пры гэтым Прэзідэнт выказаў здзіўленне, чаму ў Расіі толькі праз два дзесяцігоддзі вярнуліся да Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дакумент прапісваў правядзенне рэферэндуму аб Канстытуцыйным акце СД, які прадугледжваў урэгуляванне ўсіх пытанняў — ад агульнай валюты да органаў кіравання. Паводле яго слоў, у той час з дапамогай Дагавора аб СД можна было вырашыць многія пытанні. «І можа быць, мы ўжо сёння жылі б у нейкай форме нейкай дзяржавы. Ну, можа, не федэрацыі, а канфедэрацыі, яшчэ нейкі саюз бы прыдумалі. Можа, па прынцыпе Еўрапейскага саюза, валюта была б у нас агульная і г. д. і да т. п.».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь і Расія — не толькі дзве родныя краіны, краіны завязаныя эканамічна. «Ведаеце, калі я вызначаўся на досвітку нашай незалежнасці, з кім быць і як быць, шмат у чым лёс нашай дзяржавы і маю палітыку абумовіла тое, што мы не толькі як людзі завязаныя паміж сабой — мы родныя. Але пад гэта ўвесь эканамічны базіс быў падведзены. Наша эканоміка была фінішнай высокатэхналагічнай вытворчасцю, і мы пералапачвалі надмерна вялікую колькасць рэсурсаў, камплектуючых і іншае з Расійскай Федэрацыі перш за ўсё. Потым усё гэта ішло на экспарт. У тым ліку і два нафтаперапрацоўчыя заводы, якія былі пабудаваны менавіта для перапрацоўкі нафты і распаўсюджвання гатовых нафтапрадуктаў на вельмі прэміяльны еўрапейскі рынак. Мне трэба было захаваць, аднавіць гэтыя заводы, каб людзі працавалі, атрымлівалі хоць нейкую заработную плату і кармілі свае сем'і. Многія фактары мяне падштурхнулі да таго, каб мы мелі вось такія цесныя саюзніцкія адносіны з нашай брацкай Расіяй», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі ёсць два расійскія ваенныя аб'екты. Расія нічога не плаціць беларускаму боку за іх размяшчэнне. Літаральна праз год трэба заключаць новае пагадненне. «Мы з вас капейкі і надалей не возьмем, нават калі вы падатковы манеўр не адрэгулюеце, хай будуць у вас гэтыя грошы, таму што гэта агульная наша бяспека», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што, калі абмяркоўваецца пытанне аб тым, каб падставіць плячо Беларусі ў плане некаторых відаў узбраення, расійскі бок кажа, што гэта дорага і немагчыма. «З намёкам — трэба купіць. На што я публічна сказаў: «Вы, што, хочаце, каб я купіў у вас аўтамат Калашнікава, каб вас абараняць? Калі ў вас магчымасцяў больш, падтрымайце зараз беларускую армію». У рэшце рэшт прынялі рашэнне, будзем купляць, што зробіш, я маю на ўвазе самалёты», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка, кажучы пра беларуска-расійскую інтэграцыю, заклікаў вырашаць у першую чаргу такія надзённыя пытанні. «Нам нельга загубіць тое, што добра. У нас хапае працаўнікаў, а можа, нават ворагаў, — сказаў ён. — Гэта патэтыка, напэўна, але мы з вамі адказваем за славянскі свет, славянскую цывілізацыю. І калі мы загубім гэта, нашым дзецям будзе цяжка».

«Ніякіх замашак з боку, па меншай меры, Прэзідэнта Расіі, што Беларусь трэба інкарпараваць ці ўключыць у склад Расіі, я ні разу не чуў, нават настрою такога не было. Няма ніякіх намераў у велізарнай краіны паглынуць Беларусь», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што за час, які прайшоў пасля развалу Савецкага Саюза, вырасла пакаленне, якое прывыкла жыць у незалежнай дзяржаве. Калі сёння вынесці пытанне на рэферэндум у Беларусі аб аб'яднанні дзвюх дзяржаў і, як шмат хто ў Расіі кажа, пра ўключэнне Беларусі ў склад Расіі, 90 працэнтаў прагаласуюць супраць. «Выросла новае пакаленне, ды і старое зразумела, што мы можам жыць і супрацоўнічаць зусім у іншай форме, як родныя, блізкія. І беларусы сёння хочуць быць разам з Расіяй, але жыць у сваёй кватэры. Што ў гэтым дрэннага?» — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць у тым, што расіяне, у сваю чаргу, абсалютна не баяцца любых інтэграцыйных структур і «гатовыя хоць заўтра да аб'яднання». «Я жартам кажу, вось давайце ў склад Беларусі ўключым Расію. Думаеце, што, калі б мы сур'ёзна паставілі гэтае пытанне, расіяне былі б супраць? Не. А чаго ім баяцца?» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што расійскі бок, на жаль, не заўсёды гатовы прытрымлівацца прынцыпу раўнапраўя ў пабудове саюзніцкіх адносін.

Прэзідэнт Беларусі лічыць неабходным перш за ўсё наладзіць больш эфектыўную працу дзвюх краін у рамках Саюзнай дзяржавы.

СТАР. 2–4

# ШЧЫРАЯ РАЗМОВА

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

«Перастаньце нас вінаваціць у нахлебніцтве. Мы ў вас ніколі не былі нахлебнікамі і не будзем. Калі народ гэта чуе, асабліва я, самалюбівы чалавек, мне не хочацца ніякіх саюзаў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, Расія выдала Беларусі крэдыт на будаўніцтва атамнай электрастанцыі пад 4,8 %, а В'етнаму — менш чым пад 3 %, Арменіі — таксама менш чым пад 3 %. «Чаму? — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы. — Вось нядаўна мы вярнулі Грэфу (старшыня праўлення Ашчаднага банка Расіі. — **«Зв.»**) крэдыт, які выдалі пад паручыцельства «Беларускалія» пад 9 працэнтаў на суму каля 600 мільёнаў долараў. Мы спрабавалі дамовіцца: час прайшоў, працэнты ўпалі. Давайце дамовімся на тых умовах, як нам «ворагі» нашы заходнія крэдыты выдаюць, — пад 2 працэнты, або КНР — таксама пад 2 працэнты. Нам адмовілі, тады я даручыў ураду неадкладна адшукаць сродкі, аж да золатавалютных рэзерваў, і вярнуць банку гэтыя грошы».

«Што банк выйграў? Ён размяшчаў, атрымліваў працэнты. Вы выдалі нам крэдыт і кожны дзень кажаце, што мы далі крэдыты гэтым нахлебнікам. Дык мы 1 мільярд у год плацім па ўсіх працэнтах. Амерыканцы даюць Расіі 10 мільёнаў долараў за тыя 200 мільярдаў долараў, ці колькі вы там захоўваеце. І потым, пад які працэнт Расія ў Амерыцы трымае свае мільярды долараў? Менш за 1 працэнт», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«За якое пытанне ні вазьміся, куды ні кінь — усюды клін. І спецыялісты, і кіраўніцтва нашай краіны гэта ведаюць, але мы не апускаем народ у гэта. Гэта нашы пытанні, мы павінны іх вырашаць, але вырашаць іх трэба, яны ляжаць на паверхні», — працягнуў ён.

Закранаючы актуальную тэму цаны на расійскі прыродны газ для Беларусі, Прэзідэнт заўважыў: «На гэты год мы па прыродным газе дамовіліся, наступны год — гэта яшчэ адна баталія аналагічна падатковаму манеўру. Пакуль ніякіх рухаў з боку Расіі, колькі мы ні прапануем у рамках нашых дамоўленасцяў, не ідуць нават на перагаворы. Гэта няправільна».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусі не патрэбен танны газ. «Нашы БелАЗ, МАЗ, МТЗ, нашы людзі павінны быць у роўных умовах з расіянамі. Гэта аксіёма, ад гэтага нікуды не дзенешся, на гэтым будуюцца ўсе саюзы», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

«Нам не трэба нічога таннага, мы не хочам жыць за кошт расіян, мы хочам працаваць з вамі ў адной эканамічнай і гандлёвай прасторы на роўных умовах. Па 60 долараў рэсурсы — добра, па 200 долараў — добра, давайце па 200 долараў. Але канкурэнцыя павінна быць сумленнай і справядлівай, калі мы гатовыя будаваць нашы саюзныя адносіны, вось у чым уся праблема», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца выдзялення расійскага крэдыту, то гаворка ішла аб магчымасці рэфінансавання доўгу на 600 мільёнаў долараў. «Але калі ўжо вельмі цяжка і немагчыма (для расійскага боку. — **«Зв.»**) — на каленях поўзаць не будзем, як-небудзь разбяромся. Я не думаю, што гэта будзе для нас велізарная праблема. Тым больш што неяк наладжваюцца адносіны з заходнімі дзяржавамі, яны крэдытуюць нас у прыстойных аб'ёмах», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Расійскі палітычны эксперт Сямён Уралаў, шэф-рэдактар медыяпляцоўкі «СОНАР 2050», расказаў, што ўдзельнікі праекта, які пазіцыянуе сябе як фабрыка саюзных думак, прыйшлі да цікавых высноў наконт пакаленняў, якія сацыёлагі абазначаюць літарамі Y і Z. «Яны сапраўды інакш арыентаваныя, па-першае, у сілу суверэннага развіцця, але і з-за глабальнай ідэнтычнасці, бо фільмы, якія яны глядзяць, не нашы, яны арыентуюцца на іншыя гаджэты, на камп'ютарныя гульні і іншае. Гэтае пакаленне арыентуецца ўжо не столькі на сродкі масавай інфармацыі, колькі на новую з'яву XXI стагоддзя — масавыя камунікацыі. Гэта блогеры, ютуб-каналы, тэлеграм-канал. І вось, што ў Расіі, што ў Беларусі, менавіта сродкі масавай камунікацыі ў многім стаяць з аднаго боку на

антыдзяржаўнай пазіцыі... Яны канкрэтна парушаюць нашу бяспеку... І нашу саюзную ідэнтычнасць».

У сувязі са сказаным эксперт спытаў: «Што мы можам пакласці ў фундамент новай саюзнай ідэнтычнасці пакаленняў Y і Z?»

«Нягледзячы на тое што гэта новае пакаленне, асабліве, іншае, не кажу — добрае або кепскае... І ў нас, і ў вас кажуць: добрая ў нас моладзь, але яна іншая. Я думаю, што мы яшчэ не ведаем, якая гэта моладзь. Гэта пакаленне толькі з'явілася, і павінна прайсці шмат часу, каб даць яму ацэнку. У любым пакаленні ёсць і добрыя, і кепскія тэндэнцыі. Пакуль аб'ядноўвае гэта пакаленне і ў нас, і ў вас у Расіі адно: яны разумеюць, што беларусы і расіяне — блізкія, браты. І гэта добра. Канешне, ёсць група людзей, якія думаюць інакш. Але ў цэлым гэта ўласціва і вашаму, і нашаму пакаленню Y і Z», — адказаў Прэзідэнт.

Што датычыцца сродкаў масавай інфармацыі, то расіяне ў Беларусі не адчуюць, што знаходзяцца за мяжой. Бо тут транслююцца ўсе расійскія СМІ. «Вы «пластрэльваеце» Беларусь і трапляеце практычна да Берліна сваімі СМІ. А якія вы ведаеце беларускія СМІ, якія «пластрэльваюць» Расію да Уладзівастока?» — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт успомніў гісторыю з трансляцыяй беларускага канала «Беларусь 24», сігнал якога прымаюць у глыбінцы, але ў Маскве патрабуюць за гэта вялізныя грошы. У гэтай сувязі добра, што ў новага пакалення ёсць магчымасць глядзець і чытаць пра Беларусь у інтэрнэце, заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама анансаваў нараду па інтэграцыйных пытаннях на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, якая адбудзецца 5 сакавіка.

## Пра магчымасці для бізнесу і дабрабыт людзей

Напярэдадні «Вялікай размовы» БелТА правяло акцыю, дзе прапанавала грамадзянам самім задаць пытанне Прэзідэнту. У рэдакцыю прыйшло больш за 2000 пытанняў. Яны закранаюць і працаўладкаванне, і цэны, і іншыя тэмы. Частка з іх ужо перададзена ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Карэспандэнт БелТА прапанаваў прааналізаваць іх мясцовым уладам.

Каментуючы пытанне наконт павышэння ўзроўню дабрабыту насельніцтва, Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да прыкладу Оршы. Ён нагадаў, што спачатку не ўсё ішло гладка, але мэта была выпрацаваць узор, які магчыма распаўсюдзіць на іншыя буйныя гарады, дзе жыве каля 100 тысяч чалавек. Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на тое, што трэба звяртаць увагу на праблемы сярэдніх гарадоў.

Акрамя таго, ён адзначыў пэўную крытыку з боку грамадзян наконт праекта з гарадамі — спадарожнікамі сталіцы. Пакуль што больш заўважна, што Мінск толькі працягвае пашырацца. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такую ідэю нельга ажыццявіць у адзін момант, яна рэалізуецца паступова.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што дзяржава зрабіла шмат для таго, каб чалавек мог зарабляць для сваёй сям'і. Беларусь — транзітная краіна. У Захаду і Усходу няма іншых артэрый. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў больш развіваць сферу паслуг, тыя ж пункты харчавання ці рамонт аўто. «Трэба варушыцца, каб у беларуса прадпрымальніцкая жылка прачыналася», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, у нас свабоды для прадпрымальніцтва дадзена нават больш, чым у іншых краінах.

Таксама Прэзідэнт паведаміў, што разглядаецца магчымасць амністыі капіталу.

«Мы вывучаем гэтую праблему. Параімся цяпер з нашымі прадпрымальнікамі і бізнесменамі. У мяне гэтая тэма на стале», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што рашэнне будзе прымацца ўзважана, у залежнасці ад патэнцыйнага станоўчага эфекту. «Калі мяне пераканаюць дзелавыя колы, што гэта трэба зрабіць і гэта прынясе жаданы эфект, мы на гэта пойдзем», — адзначыў Прэзідэнт.

Канкрэтная схема амністыі капіталу ў Беларусі пакуль не прапрацоўвалася. Але калі рашэнне аб яе правядзенні будзе прынята, то на выгадных для бізнесу ўмовах, не горш, чым у Расіі. «Хутчэй за ўсё, гэта будзе проста вяртанне, легалізацыя грошай. Магчыма, нават без выплаты працэнтаў або за сімвалічныя працэнты», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пазней у ходзе гутаркі прагучала пытанне ад Яраслава Раманчука, ці лічыць кіраўнік дзяржавы, што за апошнія тры гады беларусы сталі гатовыя да рэформаў, якія неабходныя нам для эканамічнага росту? Таксама эканаміст прапанаваў зрабіць лакаматывам рэгіёнаў вялікі і сярэдні бізнес, але сказаў, што трэба перастаць іх «кашмарыць» з боку сілавых структур. Ці надышоў час змяніць парадак прыняцця эканамічных рашэнняў, каб разняволіць бізнес?

Аляксандр Лукашэнка адказаў, што эканамічна нельга быць абсалютна незалежным, бо заўсёды трэба весці гандаль і нешта набываць у іншых краін. Гэта характэрна для любой дзяржавы, нават Расіі.

«Што датычыцца свабоды, я ўжо не ведаю, якая тут свабода патрэбна для таго, каб сёння працаваць і зарабляць. Я гляджу на «Контэ», «Санта Брэмар». Хай яны не алігархі, не супербагатыя, але яны як бізнесмены вядуць сваю справу ў Беларусі, маюць свой дастатак», — адказаў Прэзідэнт. На яго думку, у нашай краіне ўжо дастаткова магчымасцяў для бізнесу. «Што датычыцца сілавікоў, тут вы перабольшваеце, што яны прымаюць рашэнні па эканамічных пытаннях», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Машэнскі, генеральны дырэктар кампаніі «Санта Брэмар», працягнуў размову пра становішча бізнесу ў Беларусі. Ён запрасіў Прэзідэнта ўзяць удзел у абмеркаванні з прадпрымальнікамі найбольш актуальных пытанняў. Бізнесмен выказаўся і пра сельскую гаспадарку: «Першы калгас, у які мы пайшлі з інвестыцыямі — гэта каля 40 мільёнаў долараў, — толькі зараз, пасля 10 гадоў, пачаў даваць аддачу. Цяпер мы гатовыя да наступнага кроку».

Аляксандр Машэнскі лічыць, што ва ўсякім разе ў Брэсцкай вобласці сельская гаспадарка, дзякуючы палітыцы дзяржавы, падымаецца на ногі і становіцца больш прывабнай для інвестыцый.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што і бізнесу трэба вучыцца: з сотняў тых, хто пачынае сваю справу, адзінкі становяцца паспяховымі бізнесменамі.

Ён падкрэсліў, што пайсці на неадкладную прыватызацыю нельга з-за таго, што гэта парушыць грамадскі баланс. Так было ў Расіі. «Усё трэба рабіць своечасова. Акуратна. Кропкава. Увесь час размаўляць з людзьмі, паказваць, што іншага шляху няма», — сказаў беларускі лідар.

Ён працягнуў тэму падтрымкі дзяржавай беларускіх прадпрыемстваў, якую закрануў Яраслаў Раманчук. «Калі аказваецца падтрымка, вывучаюцца ўсе нюансы і дэталі, — запэўніў кіраўнік дзяржавы. — Кожны праект узважваецца, зацвярджаецца Прэзідэнтам. Так, нагрузка, так, можа, не прэзідэнцкая справа, але куды падзецца. Мне галоўнае, каб быў вынік, каб эканоміка ўстала на ногі».

Ён прывёў у прыклад падтрымку баранавіцкага прадпрыемства, дрэваапрацоўчай прамысловасці, «Гомельшкла», праграму па адраджэнні вёскі.

«Так, укладалі ў сельскую гаспадарку, і нямала. Можа быць, яшчэ і не ўсе эфектыўна працуюць, але галоўную праблему вырашылі — сёння не ходзім з працягнутай рукой і ні ў кога хлеба не просім для нашага народа, — апеляваў Аляксандр Лукашэнка. — Любы праект трэба ўзважваць».

Ён запэўніў, што ніколі не дапусціць, каб сілавыя ведамствы ўмешваліся ў работу бізнесу. «Нідзе ніколі не заяўляй па-папулісцку, што ў нас сілавікі верхаводзяць тут ва ўсіх справах, асабліва ў эканоміцы, — звярнуўся Прэзідэнт зноў да Яраслава Раманчука. — Яны абараняюць дзяржаву. І дай божа любому такіх сілавікоў. Гэта людзі Прэзідэнта, адказныя перад ім. У мяне няма тут сяброў. Увогуле ва ўладзе ў мяне сяброў няма».

## Пра выбары і транзіт улады

Прадстаўнік Беларускага радыё нагадаў, што раней Аляксандр Лукашэнка казаў, што ўлада ў найбліжэйшы час будзе здаваць экзамен. Якую адзнаку ён чакае?

Кіраўнік дзяржавы адказаў, што ў сакавіку — красавіку будзе прынята рашэнне аб тэрмінах правядзення парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў. І гэта экзамен для ўсіх. «Усе будзем здаваць экзамен. І перад народам даваць справаздачу», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён упэўнены, што ўлада яго вытрымае, але трэба дзейнічаць сумленна, у тым ліку з боку СМІ.

А карэспандэнт «Радыё «Свабода» Валянцін Жданко спытаў Прэзідэнта, які са шляхоў транзіту ўлады яму найбольш імпануе, які, на яго думку, найбольш карысны для краіны.

# АБ НАШЫМ ЖЫЦЦІ

«Абяцаю вам, што на той свет мяне з прэзідэнцкага крэсла не панясуць, — адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Другое: я вам абяцаю, што дзеля сваіх дзяцей не буду трымаць уладу і перадаваць яе па спадчыне. Няма такога жадання ў дзяцей, гэта першае. Ні ў аднаго з іх, нават у самага малодшага, хоць да прэзідэнцтва яму 20 гадоў. Не перажывайце за гэта. Няма ў мяне такой мэты — па спадчыне перадаць уладу».

Наша краіна не пампуе нафту, у нас пасада Прэзідэнта — гэта вельмі цяжкая пасада, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. «Не кажу, што я пакутую, гэта маё, асабістае. Бывае, пакутую, бывае, радуюся, але я цаню тое, што мяне некалі абралі першым Прэзідэнтам Беларусі», — прызнаўся кіраўнік дзяржавы.

З нагоды меркавання пра тое, што інтарэсам захавання ўлады адпавядае ідэя аб'яднання Беларусі і Расіі, ён сказаў: «Публічна вам заяўляю: на тое, каб загубіць краіну дзеля асабістых амбіцый, ніколі не пайду. Гэта значыць перакрэсліць усё тое, што рабіў на працягу двух дзясяткаў гадоў. Таму трэба супакоіцца ў гэтым плане. Я не збіраюся сваё палітычнае жыццё працягваць за кошт нейкіх палітычных выкрутасаў або канфігурацый. Або ажыццяўляць транзіт ад сябе да сябе. Ні ў якім разе».

Усё будзе згодна з нашымі законамі, запэўніў Прэзідэнт. «Адзінае, як мне зараз падаецца: я не змагу не вылучыць сваю кандыдатуру на пост Прэзідэнта. Я зараз так думаю. Можа ж змяніцца здароўе, іншае, і прыйдзецца па-іншаму паступіць. Але зараз, каб вы потым мяне не абвінавацілі ў баязлівасці і не сказалі, што я ў цяжкую хвіліну збег, вылучу сваю кандыдатуру. Вы выбірайце любога. Можаце за мяне не галасаваць, гэта будзе нармальна, але калі нешта абваліцца потым... І калі вы мяне ў нечым папракняце, скажу: «Вы маглі за мяне прагаласаваць, але не прагаласавалі». Я хачу сам сябе ў гэтым плане абараніць».

У краіне неабходна прымаць новую Канстытуцыю, лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Я схільны сёння да таго, што новую Канстытуцыю нам сёння прыйдзецца прымаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт лічыць, што неабходна ўзмацніць іншыя галіны ўлады: выканаўчую і заканадаўчую. Магчымы нейкія змяненні ў выбарчай сістэме, але толькі пасля вельмі сур'ёзнага аналізу спецыялістаў і вывучэння досведу іншых краін.

«Я самы зацікаўлены ў тым, каб Канстытуцыя адпавядала тым рэаліям, якія складуцца ў нашай дзяржаве, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Для любога прэзідэнта, які вырашыў скончыць сваю палітычную кар'еру, — гэта самае важнае пытанне. На транзіт улады я гляджу шырэй. Мне важна, якая будзе потым пасля мяне Беларусь, важна, каб яна дасталася нашым дзецям. Гэта вельмі цяжкае і складанае пытанне».

Аднак у найбліжэйшыя два гады, падчас парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў, ніякіх змяненняў не будзе.

«Вельмі важна зберагчы стабільнасць у грамадстве і паклапаціцца аб дабрабыце людзей, — дадаў Прэзідэнт. — Гэтыя пытанні будуць у прыярытэце і пасля выбараў».

## Аб «блізкім» і «далёкім» супрацоўніцтве

«Калі шчыра, я вялікіх надзей не ўскладаю ў плане Еўразійскага эканамічнага саюза, — адказаў на чарговае пытанне Аляксандр Лукашэнка. — Занадта шмат насцярожанасці і рознагалоссяў. Больш за тое, эканамічны саюз пачынае ўсё больш палітызавацца».

Прэзідэнт звярнуў увагу на велізарную колькасць выключэнняў у гандлёвых адносінах і на невыкананне ўласна прынятых рашэнняў у рамках ЕАЭС. Паводле яго слоў, калі ўносяцца разумныя прапановы па вырашэнні той ці іншай праблемы, то рашэнне «выпустошваецца да такой ступені, што яно не мае ўжо ніякага значэння». «Нават свабоднае перамяшчэнне, адсутнасць межаў у эканоміцы для тавараў, капіталаў, людзей і іншае, кожная краіна спрабуе абысці і заблакаваць гэты рух. Таму ў нас узнікаюць праблемы», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка дзяржавы, ёсць спрэчкі ў Казахстана з Кыргызстанам, якія да гэтага часу не знятыя па шэрагу кірункаў. У Беларусі з Расіяй таксама шмат праблем. Выключаныя шматлікія групы тавараў з гандлёвых рэжымаў, асабліва што датычыцца нафты і газу, рашэнні будуць распрацоўвацца да 2025 года.

Калі казаць пра старшынства Беларусі ў ЕАЭС, Прэзідэнт адзначыў, што асабліва не разлічвае на нейкі прарыў. Гэта звязана з тым, што любыя рашэнні прымаюцца ў кансэнсусе, ад пазіцыі адной дзяржавы наўрад ці нешта залежыць. Тэндэнцыя, якая склалася, не дае вялікіх надзей.

«Спадзявацца трэба толькі на сябе, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Бу-

«Пры ВУП большым за 50 мільярдаў долараў мы як-небудзь гэта перажывём, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Калі мы дамаўляліся аб Еўразійскім эканамічным саюзе, тым больш аб прасунутай інтэграцыі ў рамках Саюза Беларусі і Расіі, мы не прасілі танныя газ і нафту, і гаворкі тады не ішло пра гэта. Але мы дамовіліся, што нашы людзі і нашы прадпрыемствы будуць працаваць у роўных умовах, — гэта краевугольны камень нашых пагадненняў і дамоўленасцяў, на іншае мы б нават не пайшлі».

Таксама Прэзідэнт закрануў тэму супрацоўніцтва Беларусі і Азербайджана. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што кантакты паміж краінамі будуюцца ў многім на асабістых сяброўскіх адносінах. Што датычыцца эканомікі, Прэзідэнт звярнуў увагу, што нафту, на жаль, закупляць мы не можам. Але рэальны сектар эканомікі дапамагаем развіваць. Паколькі ў часы Савецкага Саюза эканоміка рэспублікі трымалася на сыравіне, то пасля распаду гэта стала праблемай. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што былы кіраўнік дзяржавы Азербайджана ўзяў кірунак на стварэнне рэальнага сектара эканомікі і звярнуўся да Беларусі. «У нас існуюць тэхналогіі, якія мы гатовыя перадаць сваім сябрам, ствараем разам сумесныя прадпрыемствы. Што датычыцца ўзаемаадносін паміж людзьмі, яны складваюцца як паміж братамі. Гэта ўзор адносін мусульманскай і хрысціянскай дзяржаў», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Карэспандэнт кітайскага цэнтральнага тэлебачання спытала Прэзідэнта Беларусі пра перспектывы кітайска-беларускага супрацоўніцтва.

«Не было пытання, з якім бы я звярнуўся да кіраўніцтва Кітая і яно не было б вырашана», — так адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, як пасля праблем з пастаўкамі беларускай прадукцыі ў Расію кітайскі лідар з задавальненнем пагадзіўся адкрыць свой рынак для беларусаў. Менавіта гэта дазволіла нам прыблізіцца да формулы «30-30-30», калі па траціне экспартных патокаў прыходзіцца на Расію, ЕС і далёкія рынкі.

Другі напрамак — пабудова кітайцамі пад кітайскія ж досыць танныя крэдыты на тэрыторыі Беларусі электрастанцый, прадпрыемстваў, правядзенне мадэрнізацыі.

«Вы проста надзейны партнёр, які заўсёды, па любым пытанні падстаўляе нам плячо, — звярнуўся да прадстаўнікоў КНР Аляксандр Лукашэнка. — З кітайскай спецыфікай. Вы не крычыце, не шуміце, я вам за гэта ўдзячны. Не ўказваеце. Мы гэтак жа будзем адносіцца да вашай краіны. Тут у вас сябры. Я гэта сказаў у першы год свайго прэзідэнцтва, калі наведаў Кітай».

Пры гэтым сяброўскія адносіны з Кітаем у Беларусі ўтварыліся не адразу, яны выбудоўваліся на працягу 20 гадоў. «Кітай ніколі не спяшаецца. (Гісторыкі гэта ведаюць.) І яны вызначылі, што Беларусі можна давяраць, з Беларуссю можна працаваць», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт адзначыў, што ён атрымаў запрашэнне Старшыні КНР прыняць удзел у форуме «Адзін пояс і адзін шлях» у красавіку гэтага года і даў на яго станоўчы адказ. «Мы прыедзем на яго, а потым, ужо ў чэрвені, сустрэнемся ў Бішкеку, на сесіі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У нас дастаткова шчыльны графік. Больш за тое, прыадкрыю сакрэт: Сі Цзіньпін прапанаваў мне сустрэцца ў Пекіне акрамя гэтага».

Як растлумачыў кіраўнік дзяржавы, папярэдне магчымасць такой двухбаковай сустрэчы прапрацоўвалася на сакавік, але гэтыя планы змяніліся ў сувязі з тым, што Аляксандр Лукашэнка прыедзе ў Кітай на красавіцкі форум.

«На гэтым этапе, у сувязі з новымі ўмовамі, сітуацыяй і вакол Беларусі, і ў асаблівасці вакол Кітайскай Народнай Рэспублікі, у нас ёсць крайняя неабходнасць сустрэцца і пагаварыць пра тое, як у гэтых умовах мы будзем супрацоўнічаць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Старшыня КНР Сі Цзіньпін назваў індустрыяльны парк «Вялікі камень» жамчужынай у праекце Вялікага шаўковага шляху. Аднак кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта можа нашкодзіць нашай эканоміцы, калі пакінуць без кантролю: «Таму што там беспрэцэдэнтныя льготы для інвестараў. Калі яны пачнуць вырабляць трактары накшталт МТЗ, вядома ж, дзе ж наш трактар будзе з імі канкураваць?» — запытаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што там не павінны быць прадпрыемствы, якія будуць ствараць нездаровую канкурэнцыю айчынным. А калі яны і будуць існаваць, то прадукцыя будзе ісці не на наш рынак. Аднак пакуль што ствараюцца сумесныя прадпрыемствы. Да таго ж у індустрыяльным парку могуць будаваць свае прадпрыемствы і іншыя краіны, а не толькі Беларусь і Кітай, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## Пра Украіну

З удзелам ЗША перагаворы па Украіне пойдуць наперад сямімільнымі крокамі, заявіў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што Беларусь з'яўляецца добрай пляцоўкай для вырашэння недамоўленасцяў паміж суседзямі, і такая наша пазіцыя можа быць выгаднай для абодвух бакоў.

Ён падкрэсліў, што Беларусь гатова пры неабходнасці больш актыўна ўдзельнічаць у перагаворах. «Я не цярплю пасярэдніцтва і навязвання. Вы скажыце, што трэба, а мы будзем рабіць, каб мяне не абвінавацілі ў тым, што я міратворцам рвуся туды. Вы ведаеце маю пазіцыю, мы зробім максімум», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка жорстка выказаўся пра магчымае размяшчэнне ракет сярэдняй і меншай далёкасці ва Украіне. «Калі ва Украіне будуць размешчаны такія ракеты — гэта катастрофа, — сказаў ён. — Трэба разумець: расіяне не могуць дапусціць, каб гэтыя ракеты былі там размешчаны. Мы з расіянамі абсалютна будзем салідарныя. Таму ні ў якім разе нельга рабіць у гэтым кірунку крокі Украіне».

Прэзідэнт Беларусі не першы раз выказвае занепакоенасць магчымым размяшчэннем у Еўропе ракет малой і сярэдняй далёкасці. Як кіраўнік дзяржавы, ён у першую чаргу трывожыцца ў гэтай сувязі за Беларусь: «І не хацелася б, каб у старой матухне-Еўропе загарэлася нейкая, не дай бог, ядзерная катастрофа».

Пры адказе на адно з пытанняў кіраўнік дзяржавы закрануў і тэму прэзідэнцкіх выбараў у суседняй краіне. «Прэзідэнтам будзе Парашэнка. Ён выйдзе ў другі тур. Можа быць, з Зяленскім, можа, яшчэ з кімсьці, — выказаў Аляксандр Лукашэнка свой прагноз. — І той, хто прагаласаваў за Зяленскага, напэўна, за яго ж і прагаласуе зноў. А тыя, хто за іншых, — аддадуць галасы Парашэнку. Я кажу не абсалютна дакладна. Але думаю, пралічваючы ўсе варыянты, што Пётр Аляксеевіч гэтую пасаду захавае».

Пры гэтым Прэзідэнт Беларусі прызнаўся, што не надта паглыбляўся ў пытанні выбараў ва Украіне, але заўсёды адчувае трывогу за тое, што адбываецца ў краіне-суседцы. «Я не хачу, каб Украіну хтосьці выкарыстаў як разменную манету, каб яна была пляцоўкай розыгрышу вялікіх дзяржаў. Украінцы гэтага не заслугоўваюць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён чарговы раз прызнаўся ў цёплых пачуццях, паважае да ўкраінцаў. «Я там шмат разоў бываў, у тым ліку ў Заходняй Украіне, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — У мяне няма такога меркавання, што «западэнцы», як іх там часта называюць, — гэта нейкія дрэнныя людзі. У мяне няма такога меркавання. Гэта выдатныя людзі, працаўнікі. Нам трэба ў іх вучыцца працаваць». Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што любыя трывожныя падзеі ва Украіне прыкметна ўплываюць і на Беларусь.

«У свой час, калі лінуў паток, мы прынялі, па даных міграцыйных службаў, больш за 150 тысяч украінцаў. Указам Прэзідэнта ім дадзены роўныя правы з беларусамі. Хтосьці вярнуўся, калі стала больш спакойна. Да гэтага часу шмат людзей працаўладкаваны і працуюць тут, некаторыя ўжо жыллё сабе набылі. Мы ім дапамагалі, як маглі. Таму любая сітуацыя ва Украіне нас вельмі турбуе. І мяне асабіста», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Карэспандэнт «Комсомольской правды» запытаў, ці настаў час Беларусі выказаць сваю пазіцыю па Крыме. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што не можа быць марыянеткай і, падпісаўшы адзін дакумент (размова ідзе пра Будапешцкі мемарандум), цяпер казаць па-іншаму. Аднак звярнуў увагу, што, магчыма, неабходна было і падтрымаць Расію. «Колькі ўкраінцаў загінулі, абараняючы Крым? Ніводнага. Колькі прагучала стрэлаў падчас так званага захопу Крыма? Ніводнага. Вось вам і адказ».

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# ШЧЫРАЯ РАЗМОВА АБ НАШЫМ ЖЫЦЦІ

## Пра сем'і, пенсіі і ўклады

«У найбліжэйшы час мы прымем рашэнні. Яны павінны быць беспрэцэдэнтнымі, — праанансаваў Аляксандр Лукашэнка. — Галоўнае — гэта жыллё. Калі трэцяе дзіця нарадзілася і ты ўмоўна атрымліваеш бясплатна кватэру ад дзяржавы, думаю, будуць нараджаць».

Галоўнае пажаданне Прэзідэнта за некалькі дзён да жаночага свята 8 Сакавіка (сказаць аб гэтым папрасіла Мар'яна Шчоткіна, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня Беларускага саюза жанчын) — каб беларускі нараджалі пабольш дзяцей. «Гэта і для краіны вельмі важна, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Двое вашых, а трэці — мой. Гэта жалезабетонна».

Аляксандр Лукашэнка лічыць шматдзетную сям'ю адзіным выратаваннем для народа, асабліва ў святле тэндэнцыі скарачэння нараджальнасці, якая захапіла ўсю Еўропу. Нават у шматнацыянальнай Расіі, дзе моцныя традыцыі шматдзетных сем'яў у розных народнасцяў, усё роўна гэтая тэндэнцыя прасочваецца.

Пры гэтым Прэзідэнт са шкадаваннем адзначыў, што знайсці сапраўдных мужчын у Беларусі нашым жанчынам не так проста. «З мужыкамі, вядома, бяда», — прызнаў Аляксандр Лукашэнка, спаслаўшыся на вялікую колькасць тых, хто мае адтэрміноўку ад войска.

Галоўны рэдактар газеты «Народная воля» Іосіф Сярэдзіч спытаў, ці знойдзе дзяржава магчымасці вярнуць людзям грошы, якія «згарэлі» на банкаўскіх укладах пасля развалу СССР.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што даручыць ураду пралічыць, пра якую суму ідзе размова. «Каб сказаць, у якія тэрміны мы вернем гэтыя грошы, трэба паглядзець, якая гэта сума, з улікам дэнамінацыі, каб суаднесці з бюджэтам. Абяцаю вам, што адкажу на гэта пытанне. Калі гэта пацягне на ўзровень Паслання, то скажу пра гэта ў Пасланні Прэзідэнта народу і парламенту», — адказаў кіраўнік дзяржавы.

Старшыня Таварыства беларускай мовы, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алена Анісім запытала наконт пенсій. У работнікаў рэальнага сектара эканомікі пенсіі часцей за ўсё ніжэйшыя за 400 рублёў, пры гэтым яны часам не могуць атрымаць якасныя медыцынскія паслугі. Дэпутат пагадзілася, што мы не можам адначасова падняць усім пенсіі, але маглі б разгледзець варыянт ільготнага праезду і аплаты медыцынскіх паслуг. На яе думку, наша моладзь у тым ліку хоча з'язджаць з краіны, бо бачыць, як жывуць зараз іх бабулі і дзядулі.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што ў нас невялікія пенсіі. З гэтым трэба разбірацца, як і з дэмаграфічнай сітуацыяй. «Разбяромся са шматдзетнымі сем'ямі, а то праз 30 гадоў нікога не застанецца, таму што жанчыны нараджаць не хочуць, мужыкоў нармальных няма. А там і пенсіямі зоймемся», — сказаў Прэзідэнт.

## Пра Курапаты, мову і ідэалогію

Журналіст «Еўрарадыё» задаў пытанне пра інфармацыйную бяспеку. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што яго больш хвалюе не пагроза па-за межамі краіны, а некалькі мы здольныя і гатовыя абараняцца. Першае — трэба разабрацца ўнутры. «Любыя гарачыя сутыкненні пачынаюцца з інфар-

*(Заканчэнне. Пачатак на 1—3-й стар.)*

мацыйных войнаў. І мы павінны ўмець ім процістаяць», — лічыць Прэзідэнт. Гэтае пытанне ўжо сёння вырашаецца, запэўніў кіраўнік дзяржавы.

«Давайце будаваць сваю інфармацыйную бяспеку не за кошт іншых ці за кошт нападкаў на іншых», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. Таксама ён дадаў: «Мы ўсе прыхільны з вамі, і я перш за ўсё, да нашых суверэнітэту і незалежнасці. Толькі ў нас розныя метады барацьбы за гэта».

Другое пытанне прадстаўнік «Еўрарадыё» задаў наконт беларускай мовы і вышэйшай навучальнай установы, дзе б выкладалі па-беларуску. Прэзідэнт адказаў, што пытанне наконт ВНУ прапрацоўвалася. У Беларусі дастаткова прадметаў выкладаюць на беларускай мове, упэўнены Прэзідэнт.

Цягам гутаркі асаблівую ўвагу на моўнае пытанне звярнуў і грамадскі дзеяч Алег Трусаў. Зараз абсалютная большасць законаў выходзіць па-руску. Па яго словах, суддзі нават наймаюць перакладчыкаў, каб разабрацца ў беларускамоўных справах. На думку Алега Трусава, кожны суддзя павінен ведаць дзве мовы. Таксама ён папрасіў Палату прадстаўнікоў і Савет Міністраў выдаваць законы на дзвюх мовах.

Аляксандр Лукашэнка адказаў, што беларуская мова, як і руская, для яго родная. На яго думку, не трэба іх ставіць у процівагу, але і насаджаць такія паняцці, як «рускі свет», не трэба. У нас беларусы размаўляюць на рускай, таму гэта частка і нашай культуры. Прэзідэнт пагадзіўся, што мова — гэта тое, што нас адрознівае ад рускіх і ад іншых нацыянальнасцяў. Гэта асаблівасць народа. Трэба падтрымліваць і гэтыя тэндэнцыі. Наконт выдання законаў на дзвюх мовах Аляксандр Лукашэнка адказаў, што гэта магчыма, але пацягне дадатковыя выдаткі.

Наконт нацыянальнай ідэнтычнасці Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што трэба паказваць, чым беларусы адрозніваюцца ад іншых народаў, нашы нацыянальныя рысы.

Звярнуўся Прэзідэнт і да тэмы Курапатаў. Ён нагадаў, што даручыў паставіць помнік у Курапатах. «Неабходна прывесці месца ў парадак: там пахаваныя нашы людзі», — адзначыў ён. Пры гэтым дадаў, што не бачыць нічога дрэннага ў кафэ «Поедем, поедим», якое стаіць недалёка. «Рэстаран жа не супраць Курапат. І тое, што туды заходзяць людзі, гэта нармальна», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы, што тэма Курапатаў выкарыстоўваецца некаторымі ў прапагандысцкіх мэтах. «Так, было. Паглядзіце на іншыя краіны — там таксама не тысячы, а мільёны гінулі. Але трэба выпукліць вось гэты сталінскі перыяд, паказаць, што былі ворагі, — адзначыў ён. — Так, былі і такія. Можа быць, празмерна. Але гэта не значыць, што пад сталінізм трэба заганяць усё. Там забівалі людзей, дапусцім, пры Сталіне — у 30-я гады. А вы ўпэўнены, што там, на гэтым месцы, фашысты не расстрэльвалі яўрэяў, беларусаў, палякаў, украінцаў, рускіх? Ну, дык давайце будзем аб'ектыўнымі».

Кіраўнік дзяржавы закрануў і тэму разбітай «лавы Клінтана» ў Курапатах. Ён паведаміў, што распарадзіўся неадкладна яе аднавіць і назваў глупствам усе сцвярджэнні, што ўлады маюць да яе пашкоджання хаця б нейкае дачыненне.

Аляксандр Лукашэнка закрануў і пытанні ацэнкі гісторыі Беларускай Народнай Рэспублікі. Прэзідэнт адзначыў, што датычыцца ролі і значэння БНР, што «мы спакойна рухаемся ў напрамку таго, каб разабрацца — як было і што было, — без прапаганды».

Ён падкрэсліў, што вялікая роля стабільнасці і міру ў дзяржаве — у адзінстве народа: «У нас сваіх праблем дастаткова. Ніякае бязладдзе — ні з Расіі, ні з Захаду, ні далей — ніхто нас не адолее, калі мы тут будзем адзіныя. Калі мы будзем дзейнічаць так, як мы з вамі гэта разумеем, так, як у нас у галовах. А не так — думаем аднолькава, а паводзім сябе па-рознаму.

Размову пра нацыянальную ідэнтычнасць працягнуў беларускі эксперт Аляксей Дзермант. Ён заўважыў, што, нягледзячы на тое, што ў Беларусі пакуль не напісаны добры падручнік па ідэалогіі, яе каштоўнасці і патрыятызм грунтуюцца на практыцы беларускай дзяржавы. Маўляў, гэтая практыка і ёсць наша ідэалогія. Пры гэтым нам, магчыма, не хапае актыўнасці ў гэтай сферы.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што праблема не столькі ў адсутнасці добрага падручніка па ідэалогіі або манаграфіі на гэту тэму. «Мы дагэтуль не змаглі выразна сфармуляваць нацыянальную ідэю. Такую ідэю, якая б захапіла ўвесь народ. Усё, што мне прапаноўвалі, збіта, нешта не падыходзіць нам. Быў бы надзвычай удзячны, калі б нехта сфармуляваў гэту ідэю і пераканаў мяне ў тым, што гэта тое, што трэба, каб яна лягла на душу народу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пагадзіўся, што ідэалагічная работа ў краіне праводзіцца недастаткова якасна. «Час змяніўся, трэба ісці іншым шляхам, — сказаў ён. — Патрэбны новыя формы, флэшмобы, тое, што будзе зразумела моладзі. Ідэалогія павінна быць больш скіраваная на моладзь».

Пры гэтым мы не павінны капіраваць тое, што робяць суседзі, калі ў нас ужо ёсць сваё. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы прывёў у прыклад расійскую акцыю «Бессмяротны полк» і беларускую — «Беларусь помніць».

Прэзідэнт лічыць, што нельга забываць і старыя формы ідэалагічнай работы. Ён адзначыў, што ўдалося ўцягнуць моладзь у дэманстрацыі на Дзень Перамогі, і гэта добра.

Ён нагадаў у сувязі з гэтым пра новыя формы работы на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, напрыклад святочны баль у Палацы Незалежнасці, у якім разам з моладдзю бралі ўдзел і найвышэйшыя службовыя асобы дзяржавы. «Хачу, каб гэта стала традыцыяй. Трэба, каб гэта захавалася», — сказаў Прэзідэнт.

Гэта датычыцца і ўласна будынка Палаца Незалежнасці, на экскурсіі ў які тысячы людзей чакаюць чаргі. Як і ўзведзены нядаўна будынак Вярхоўнага Суда Беларусі — гэта сімвалы нашай незалежнасці і суверэнітэту, падкрэсліў беларускі лідар.

Палітолаг Вадзім Гігін выказаў сваё меркаванне пра ідэалогію. Ён звярнуў увагу на тое, што мы самі павінны фарміраваць парадак дня, шукаць у гісторыі факты і асоб, якія здольныя аб'яднаць людзей розных поглядаў. На яго думку, нацыянальная ідэя, мабыць, і не да канца, але ўжо сфарміравалася.

Аляксандр Лукашэнка не з усім пагадзіўся. На яго думку, нацыянальная ідэя павінна быць асаблівай, класціся на душу і сэрца. «З майго пункту гледжання, мы гэту нацыянальную ідэю не выпрацавалі, такую, за якую магчыма зачапіцца», — пракаментаваў Прэзідэнт. Мабыць, час не прыйшоў.

Што датычыцца ідэалогіі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта няпростая праца, ідэолагі — паштучны тавар, трэба звяртаць на людзей з такімі здольнасцямі асаблівую ўвагу і прыцягваць іх да работы.

## Пра музыку і музеі

Адказваючы на пытанне пра нацыянальны адбор конкурсу «Еўрабачанне», Прэзідэнт пагадзіўся, што перамога ў гэтым конкурсе працуе на імідж краіны, і адзначыў, што ён сочыць за працэсам унутранага адбору. «Калі на гэта трацяцца грошы, то нехта павінен несці адказнасць. Каго пасылаем? Хто павінен адказваць за гэта? Арганізатар і журы», — заўважыў ён.

«Павінны паехаць годныя людзі, якія перамогуць у адборы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Ні ў якім разе ніякіх прэферэнцый быць не павінна. Перамаглі — паехалі».

Ён падкрэсліў, што тут недапушчальнае прасоўванне «сваіх». Пры гэтым дадаў: «Еўрабачанне» — гэта не чыста музычны конкурс, гэта даўно палітызаваны конкурс. І рэдка бывае, што там пераможа той, хто павінен. Асабліва пры галасаванні на постсавецкай прасторы».

Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што сам любіць лірычную музыку. Пры гэтым у яго сям'і ёсць аматар і выканаўца класікі — сын Мікалай.

У працяг тэмы культуры было ўзнята пытанне будаўніцтва ў Мінску музейнага квартала. «Калі там невялікія грошы і можна паскорыцца, то потым дапамагу, усё роўна ж будзем будаваць. Пажадана хутчэй», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, даручыўшы старшыні Мінгарвыканкама Анатолю Сіваку асабіста ацаніць аб'ём работ на будаўніцтве.

«А то мы расцягнем гэтую будоўлю, і яна нам у два разы даражэй абыдзецца. Адшукаем без бюджэту грошы, трэба паглядзець, ці шмат там працы і ў якія тэрміны можам пры нармальным фінансаванні гэта ўсё завяршыць», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Як расказаў генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў, першую чаргу музейнага квартала плануецца адкрыць у 2020 годзе. На гэтым мерапрыемстве будуць чакаць і Прэзідэнта.

Уладзімір Пракапцоў таксама агучыў просьбу аб сустрэчы з кіраўніком дзяржавы ад Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў, якая аб'ядноўвае мастакоў, музыкаў, архітэктараў і іншых творчых людзей. Прадстаўнікі саюзаў маглі б агучыць просьбы і праблемы, прычым многія з іх не патрабуюць фінансавых уліванняў, адзначыў ён. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што гэта правільная і вельмі добрая прапанова, і даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта прадумаць фармат сустрэчы.

## Пра хакей і трэнажоры ў вёсках

Аляксандр Лукашэнка выказаўся пра стан спраў у беларускім хакеі.

«Я быў ініцыятарам гэтай суперсерыі паміж хакейным клубам «Дынама-Мінск» і зборнай экстралігі, — адказаў ён на адно з пытанняў. — Нягледзячы на вялізную ўвагу да гэтага віду спорту ў нас у краіне, мы атрымліваем адваротны вынік. Нацыянальная зборная вылецела з эліты сусветнага хакея, «маладзёжка» таксама. Я пачаў прад'яўляць жорсткія прэтэнзіі да адказных асоб, пачынаючы з Федэрацыі хакея, трэнераў вядучых клубаў і да ўрада. Тыдзень таму прапанаваў Міхаілу Захараву ўзмацніць яго «Юнацтва» і згуляць супраць мінскага «Дынама», якое рана скончыла сезон. Хто выйграе серыю — той будзе ў КХЛ. Прымаючы такое рашэнне, хацеў паглядзець, чаго варты наш унутраны чэмпіянат».

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што пры фарміраванні складу і трэнерскага, і хакеістаў на наступны сезон неабходна рабіць стаўку на айчынных спецыялістаў і гульцоў, а таксама правесці якасную міжсезонную падрыхтоўку. «Бардака ў хакеі ў нас хапае: па знаёмстве ўзяць сябра, таму Дзмітрый Баскаў і павінен навесці там парадак», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнту спадабаліся дзве мінулыя гульні, ён адзначыў падтрымку заўзятараў на дзвюх арэнах і плануе наведаць трэці матч гэтых камандаў у «Мінск-Арэне».

Адно з пытанняў датычылася магчымасці трэніровак для дзяцей з малых населеных пунктаў. Журналістка рэгіянальнага партала Мінскай вобласці расказала Прэзідэнту гісторыю дзяцей з вёскі на Случчыне, якія арганізавалі сваімі сіламі нешта накшталт фітнес-клуба ў закінутым будынку. Неўзабаве самаробная «трэнажорка» была закрытая — з меркаванняў бяспекі. Карэспандэнт паказала невялікі відэаролік-зварот сельскай моладзі да ўсіх неабыякавых з просьбай дапамагчы ў стварэнні паўнавартаснай фітнес-залы.

«Натуральна, мы адрэагуем на гэта, — запэўніў Аляксандр Лукашэнка і даручыў намесніку прэм'ер-міністра Ігару Петрышэнку заняцца гэтым пытаннем. — У школе арганізаваць лепш было б. У аграгарадках буйных мы так і робім цяпер комплексы ў школе. Дзеці і бацькоў цягнуць на гэтыя пляцоўкі».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пытанне варта разгледзець шырэй, не толькі ў рамках прыватнага выпадку. «Гэта павінна нас падштурхнуць да сур'ёзнага роздуму. Таму з міністрам адукацыі займіцеся і мне далажыце (аб праведзенай працы. — **«Зв.»**)», — сказаў Прэзідэнт.

**На «Вялікай размове» працавалі Надзея АНІСОВІЧ, Марыя ДАДАЛКА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. Фота БелТА.**

Меркаванні

# «ЦІКАВА БЫЛО ПАЧУЦЬ КАМПЕТЭНТНЫЯ АДКАЗЫ»

**Аляксандр КЛІЦУНОЎ, галоўны рэдактар газеты «Витебские вести»:**

— Сёння адбылася сапраўды вялікая размова з Прэзідэнтам. Як заўсёды, гутарка была адкрытая, шчырая. Слова «шчырасць» сёння гучала не адзін раз, нават з вуснаў кіраўніка дзяржавы. Размова шмат у чым датычылася пытанняў міжнароднай палітыкі, пачынаючы ад саюзных адносін з Расіяй да пытанняў Венесуэлы, Сірыі. Адносна ўнутранай палітыкі трэба заўважыць, што больш за 2000 пытанняў адрасавалі грамадзяне Аляксандру Лукашэнку. Яны будуць перададзены ў Адміністрацыю Прэзідэнта і стануць асновай для складання чарговага Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Таму я ўпэўнены, што пытанні знойдуць сваё адлюстраванне ў адным са знакавых дакументаў. Сімвалічна, што гутарка скончылася на тэме сям'і, дзяцінства, віншавання жанчын з надыходзячым святам 8 Сакавіка.

**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

— Самае галоўнае, што дзяржава — гэта велізарны карабель. Дзе ўсё ўзаемазвязана, і кожная галіна звязана адна з адной. Ад таго, як спрацуе эканоміка, як будзе напоўнены бюджэт, так, адпаведна, будзе і расці заробак у той жа бюджэтнай сферы, што таксама немалаважна для сістэмы адукацыі. Зноў жа мы кажам пра якасць падрыхтоўкі спецыялістаў для таго, каб тыя ж галіны эканомікі актыўна развіваліся, каб спецыялісты былі сапраўднымі драйверамі гэтага ўстойлівага эканамічнага росту. Усё ўзаемазвязана, і, напэўна, гэты пасыл быў дастаткова сур'ёзным. І мне падаецца, ва ўнісон гучала тэма пошуку нацыянальнай ідэі, якая б усіх аб'яднала, якая б сапраўды аб'ядноўвала людзей. У сістэме адукацыі, яе канцэпцыі ўстойлівага развіцця ёсць таксама пэўны элемент, які можа легчы ў аснову гэтай нацыянальнай ідэі.

Фота БелТА.

**Сяргей СЫРАНКОЎ, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама:**

— Беларусы заўсёды цанілі стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, у тым ліку і ў вырашэнні такіх стратэгічных пытанняў, як выстройванне дыпламатычных адносін з Расійскай Федэрацыяй і Еўрасаюзам. Словы Прэзідэнта пра гонку ўзбраенняў і пра тое, што Беларусь ніколі не будзе пагражаць Польшчы вайной, лічу сведчаннем таго, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца сёння гарантам міру і бяспекі. Спадабаўся таксама адказ на пытанне, якім чынам можна павысіць дабрабыт беларусаў. Прэзідэнт параіў проста пачаць працаваць. Гэта вельмі актуальна ва ўмовах сённяшняй самазанятасці.

**Алег КАНДРАЦЕНКА, дырэктар IT-кампаніі LWO:**

— Было шмат важных тэм. Для кожнага яны былі свае, для кожнага яны былі пра набалелае. Яшчэ да з'яўлення ПВТ мы бралі проста рубель, укладвалі ў новы прадукт, распрацоўвалі праграму. І гэты рубель поўнасцю аддавалі на заробкі і на падаткі, дык потым па нашых правілах дагэтуль дзейнічаюць, 18 працэнтаў павінны былі прыплаціць. Гэта значыць, укладваеш 10 мільёнаў долараў і 1,8 мільёна яшчэ зверху. ПВТ самае галоўнае што зрабіў — дазволіў нам па-сумленнаму плаціць падаткі і пры гэтым не сыходзіць у глыбокія мінусы адразу, ствараць прадукт. Таму тое, што трэба, я ўпэўнены, IT-галіна не проста адпрацуе, яна яшчэ і зробіць лепш.

**Сяргей МАЗАЙЛА, дырэктар тэлерадыёвяшчальнага канала «Гродна Плюс», дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— Першае ўражанне па выніках гутаркі: не было тэмы, аб якой бы нельга было гаварыць, прычым у зале знаходзіліся як прадстаўнікі дзяржаўных, так і недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, не толькі беларускія.

Другое: Прэзідэнт сам папрасіў, каб гэта былі не адказы на пытанні, а сапраўдная гутарка. На канструктыўныя прапановы, нягледзячы на тое, ад каго яны ішлі, рэагаваў станоўча і тыя, што патрабуюць прапрацоўкі, даручаў кіраўніку Адміністрацыі. Калі я з некаторымі момантамі быў нязгодны, даводзіў контраргументы, даваў тлумачэнні.

Размова не абмяжоўвалася Беларуссю, падчас гутаркі выйшлі на міжнародныя пытанні, закранаючы Грузію, Украіну, Азербайджан і Кітай.

**Наталля НОВІКАВА, загадчыца аддзела магілёўскага інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці»:**

— Такія размовы дазваляюць падымаць праблемы, якія даўно наспелі ў грамадстве і патрабуюць адказу. Зваротная сувязь вельмі важная як для ўлады, так і для простых людзей. І мне імпануе тое, што магчымасць задаць пытанне кіраўніку краіны існуе ў прадстаўнікоў розных слаёў насельніцтва. Апошнім часам людзі сталі вельмі цікавіцца знешняй і ўнутранай палітыкай нашай краіны і суседніх. Грамадзян хвалюе, якое месца на палітычнай карце займае Беларусь у адносінах да Расіі. І Прэзідэнт даў з гэтай нагоды вычарпальны адказ.

**Юрый ДОЎНАР, першы намеснік галоўнага рэдактара газеты «Прессбол»:**

— Я ўпершыню прысутнічаў на такім мерапрыемстве, але нашу газету часта запрашаюць на такога роду сустрэчы. Было цікава паглядзець на шэраг СМІ, якія прысутнічалі, на калег з Украіны, Расіі, Грузіі. Я прадстаўнік спартыўнага выдання, яно вузкаспецыялізаванае. Але спорт — гэта заўсёды актуальная сфера. Я задаў пытанне Прэзідэнту пра хакей, бо зараз адбываюцца значныя матчы, адзін з іх будзе ў суботу. Цікава было пачуць кампетэнтнае меркаванне кіраўніка дзяржавы.

4 сакавіка — Дзень беларускай міліцыі

# СЯМЕЙНАЕ СВЯТА

**У панядзелак супрацоўнікі міліцыі 102-і раз адзначаць прафесійнае свята. Дата больш чым сімвалічная, бо менавіта гэты нумар набіраюць тыя, каму патрэбна дапамога.**

У сям'і Міхалевічаў 4 сакавіка — двайное свята, сужэнцы Дзмітрый і Іна абое на працягу дваццаці гадоў працуюць у органах унутраных спраў. Больш за тое, менавіта служба і вучоба ў структуры МУС дапамаглі ім знайсці адно аднаго.

— На трэцім курсе Магілёўскага вышэйшага каледжа МУС мы пазнаёміліся з Дзімам, а праз тры месяцы сустрэч ён прапанаваў мне стаць яго жонкай, — успамінае Іна.

Сёння былыя курсанты займаюць пасады ў розных структурах МУС. Падпалкоўнік Дзмітрый Міхалевіч — намеснік начальніка Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні. А Іна — інспектар аддзела па грамадзянстве і міграцыі Партызанскага РУУС сталіцы. Але галоўнае багацце сямейнай пары — двое дзетак: 10-гадовы Іван і 8-гадовая Дзіяна. Ваня займаецца пяцібор'ем і каратэ, але нягледзячы на поспехі ў спорце марыць стаць кухарам, а вось Дзіяна плануе пайсці па слядах бацькоў і стаць міліцыянерам. Зараз дзяўчынка паспяхова займаецца мастацкай гімнастыкай, а таксама добра малюе.

**Андрэй САЗОНАЎ, фота аўтара.**

## ОТЧЕТ
## Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» об использовании своего имущества за 2018 год

Количество учредителей Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» (далее – Фонд) – 4.

Информация о стоимости имущества Фонда:

– стоимость имущества: 49921,79 бел. руб.;

– поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с уставом Фонда (целевое финансирование), составляют 0 бел. руб.;

– поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 800,00 бел. руб.

Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе Фонда, составила 0 бел. руб. Фонд не имеет филиалов, не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

УНП 490912965

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» ОАО «Минскоблхлебопродукт» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **склада мешкотары, общей площадью 207,4 кв. м инв. № 622/С-45500**, расположенного на земельном участке с кадастровым номером **625450100001004547** (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью **0,0414 га**, по адресу: **Минская область, Столбцовский район, г. Столбцы, ул. Багинского, 18А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **43 261,90** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **4 326,19** бел. руб.).

**Условия продажи:**

поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **04.04.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.04.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-47276 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание птичника), обшей площадью 1235,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 26Д

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 423650100025000003, площадью 0,6035 га (назначение – для обслуживания здания птичника), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 26Д. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2 площадью 0,0283

Начальная цена продажи – 83 889,26 руб. (восемьдесят три тысячи восемьсот восемьдесят девять рублей двадцать шесть копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 8 389 руб. (восемь тысяч триста восемьдесят девять рублей)

Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 45-05-38, 41-98-32

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 марта 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 24.11.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 13 марта 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».*
*Дополнительная информация: http://grodnoino.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении четвертых повторных публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок»

**Дата и время проведения: 14.03.2019 в 11.00.**

Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 09.00 04.03.2019 до 09.00 14.03.2019

| № лота | Наименование | Инв. № | Год | Начальная цена, руб., | Шаг аукциона, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированные помещения неустановленного назначения (битумно-перлитный цех), общ. площ. 2294,4 кв. м | 110/D-2776433 | 1975 | 24120,00 | 2412,00 | 2412,00 |

1. Продавец и организатор торгов: ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок», тел. +375 163414964.
2. Ранее опубликованное извещение 17.01.2019 в газете «Звязда».
3. Место проведения: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46, здание администрации.
4. Место нахождения предмета торгов: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46 зем. уч. № 141000000003000649
5. Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок, заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий счет предприятия, с отметкой банка Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение десяти рабочих дней со дня их проведения.

Ознакомиться с предметами торгов можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375 29 8091058.

По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.

С победителем торгов продавцом в срок не позднее 25 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги не позднее 3 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть подан этому участнику по цене, превышающей начальную на 5 % УНП 200240785

## *ООО «Центр Белинвентаризация»* г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

**Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
**Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
**Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

**Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 12**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – капитальное строение (магазин № 9) с инв. №350/С-85625, площадью 326,3 кв. м (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное основное строение, одноэтажная блочная пристройка, навес с эстакадой, навес), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 275;<br>– охранно-пожарная сигнализация (инв. № 22358);<br>– капитальное строение (сарай металлический магазина № 9) с инв. № 350/С-202808, площадью 72,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 275/1;<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006135 площадью 0,1031 га | 720 000,00 | 72 000,00 |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 1 апреля 2019 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **2 апреля 2019 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещения в газете *«Звязда» от 02.03.2019 г.* |
| Условия продажи | Объект продается в собственность. Цель использования – розничная торговля продовольственными товарами. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 3 (три) месяца. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Для участия в аукционе необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствие с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация»

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

## Пережирский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенного на территории сельсовета

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Зазерка, ул. Народная, 4А, 624484804601000787 | 0,1312 | Электр., газ, ЖД-сообщение | 1387,09 + расходы за размещение объявления | 6281,86 | 628,19 |

Задаток перечисляется на р/с **BY2OAKBB36006251300090000000,** г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», код **AKBBBY2X,** УНП 600537220 (казначейства), УНН 600177731 (сельисполкома), ОКПО 04429668, код платежа – 04901, ПЕРЕЖИРСКИЙ сельский исполнительный комитет.

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

Аукцион состоится **5 апреля 2019 года** в 10.00 по адресу: д. Пережир, ул. Гуриновича, 2«а» (здание исполкома) Пуховичского района Минской области.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 4 марта по 1 апреля 2019 года с 8.00–17.00 по вышеуказанному адресу.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры по земельным участкам, подлежат возмещению в установленном законодательством порядке.

Телефоны: (801713) 46-3-96, 78-8-35. 78-8-36.

Сайт в интернете Пуховичского райисполкома, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

## Каменский сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 3 апреля 2019 года открытого аукциона по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка (бел. руб.) | Расходы по изготовлению документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Малиновка, 9А,** кадастровый номер 623282706101000043 | 0,2495 | Ограничения в использовании отсутствуют.<br>Черта населенного пункта.<br>Имеются сети: водоснабжение | 2 000,00 | 400,00 | 1770,51 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 3 апреля 2019 в 11.00 по адресу: Логойский район, аг. Камено, ул. Центральная, д. 7А, Каменский сельский исполнительный комитет.

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 29.03.2019 включительно; к заявлению прилагается квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет № BY42AKBB36006190711030000000 в ЦБУ № 611 филиала № 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойска, БИК банка AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа – 4901, получатель – Каменский сельский исполнительный комитет, УНН 600181630.

**Условия:** победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона. Рассрочка платежа не предоставляется.

Конт. тел.: (801774) 72 3 81, 72 3 35; (+37529) 170 02 61.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры»

## Проведение третьих повторных торгов по продаже имущества ООО «Черный егерь»

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, руб. | Сумма задатка 5 %, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание придорожного кафе (не завершенный строительством единый объект недвижимого имущества инв. № 614/U-34310) | 124 822,21 | 6 241,11 | 6 241,11 |

Местонахождение: **Минская обл., Смолевичский р-н, автодорога М1/Е30 Брест (Козловичи) – Минск – граница РФ (Редьки), 379 км (лево).**

**Характеристики объекта:**

в состав единого объекта недвижимого имущества входят:

незавершенное законсервированное 2-этажное здание придорожного кафе с цокольным этажом (инв. № 614/U-34310), процент готовности основного строения – 44 %, цокольного этажа – 73 %, общая площадь здания – 284,2 кв. м;

не завершенные строительством недвижимые улучшения (строительно-монтажные работы по возведению 2-го этажа придорожного кафе), в т. ч. строительные материалы;

земельный участок с кадастровым номером 624800000001000909 (право аренды).

Торги в форме открытого аукциона будут проведены по адресу: г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, каб. 18, начало – **18 марта 2019 г., в 10.00**.

**Письменная заявка на участие в торгах и копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, должна быть подана с 09.00. 02.03.2019 по 18.00. 13.03.2019 по адресу организатора торгов.**

Задаток на участие по лоту составляет 5 % от его начальной цены и должен быть перечислен по **13.03.2019** на расчетный счет продавца – ООО «Черный егерь», 222201, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Торговая, д.14В, р/с BY14 TECN 3012 1363 1001 4000 0000, в ОАО «Технобанк», г. Минск, ул. Кропоткина, д. 44, код TECNBY22, УНП 690821358, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в торгах **18.03.2019.** Организатор торгов: ООО «БизнесУэй», г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, комн. 18, тел. +375 (29) 165-33-65. Продавец: **ООО «Черный егерь».** Ознакомиться с лотом можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия. Цена без НДС (УСН). В случае признания торгов несостоявшимися по причине участия одного претендента, лот может быть продан ему с его согласия по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. Победителем торгов (претендентом на покупку) возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в размере **1091,76 руб.** Срок подписания договора купли-продажи по 28.03.2019. Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в открытых торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by в разделе «Должник – ООО «Черный егерь» – имущество – реализация».

Меркаванне

# КСЕНАФОБІЯ — ГЭТА НЕ ПА-НАШАМУ

## Брэсцкі абласны суд абвясціў рашэнне: 24 гады пазбаўлення волі неаязычніку, які забіў цяжарную жанчыну

**Пра тое страшнае забойства пісалі шмат у лютым мінулага года. У тым ліку і наша газета. У Кобрыне вечарам на цёмным баку вуліцы зламыснік напаў з нажом на сямейную пару. Спачатку ён некалькі разоў ударыў мужчыну, потым стаў рэзаць жанчыну, якая была на апошніх месяцах цяжарнасці. І, відаць, дабіў бы абаіх, каб не выпадковы нарад міліцыі, што праязджаў побач. Забойца спалохаўся і ўцёк. Міліцыянеры сталі аказваць дапамогу людзям, што сцякалі крывёю. Мужчыну адвезлі ў бальніцу, яго ўдалося выратаваць. Жанчына і яе ненароджанае дзіця загінулі.**

Потым, калі яго затрымалі, высветлілася, што хлопец не ведаў іх раней і не меў намеру забіваць менавіта іх. У той вечар з халоднай зброяй ён выйшаў на паляванне... на людзей. Яму сустрэлася вось гэтая маладая пара цыганоў, якія ішлі ў госці да сваякоў. Калі б на шляху забойцы аказаўся яўрэй, кітаец, карэец, магчыма, яго спасціг бы той жа лёс. Ён ненавідзеў людзей па нацыянальнай і расавай прыкмеце. Усё гэта пазней высветлілася падчас следства.

Следчыя прыйшлі да высновы, што на сваёй старонцы «УКантакце» пад выдуманым імем Святаслаў Ваяводзін хлопец адкрыта прапагандаваў гвалт у адносінах да прадстаўнікоў нябелай расы і нацыянальную варожасць. Абвінавачанне палічыла, што матывам нападзення стала яго прыхільнасць да неанацысцкай, фашысцкай, расісцкай, нацыяналістычнай ідэалогіі. На яго старонцы перыядычна мільгала выява Гітлера, паяўляліся знакі свастыкі. Адпаведныя татуіроўкі хлопец насіў на руцэ. У яго быў створаны цэлы альбом адпаведных матэрыялаў, відэаролікаў па азначанай тэме. З усіх гэтых матэрыялаў патыхала нянавісцю.

Хто ж гэты забойца, што так старанна рыхтаваў сваю чорную справу, што доўга выхоўваў у сабе «місіянера па ачыстцы грамадства»? Пра апошняе, дарэчы, гаворыцца ў дакуменце абвінавачання: «Абвінавачваны адчуваў нянавісць і нецярпімасць да асоб цыганскай нацыянальнасці, абвінавачваў іх у паразітычным ладзе жыцця, неахайнасці, незаконным узбагачэнні, апанаваны місіяй забіць прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасці з мэтай «ачышчэння» грамадства, 11 лютага 2018 года...» Дык вось гэта адзін з нашых юнакоў, 20-гадовы ўраджэнец Пінска, навучэнец чацвёртага курса Кобрынскага політэхнічнага каледжа. Ён вучыўся на рэзчыка па дрэве. Хлопец добра малюе. Не курыць, не п'е, заўсёды займаўся спортам. «Неканфліктны, ветлівы, дысцыплінаваны, з усімі меў роўныя адносіны, добра вучыўся, сярэдні бал складае амаль 7,5» — так пра яго гаварыла ў судзе дапытаная ў якасці сведкі выкладчыца, куратар групы. Яшчэ ў ходзе следства высветлілася, што абвінавачваны цікавіўся гісторыяй, многа чытаў, асабліва пра Старажытную Русь, у яго кнігі адпаведныя бачылі на тумбачцы.

...Цікавіўся гісторыяй, але трактаваў падзеі па-свойму — згадалі аднакурснікі. Калі праходзілі тэму Другой сусветнай вайны, дзе гаварылася пра Халакост, масавае забойства людзей цыганскай нацыянальнасці, Андрэя прарывала, ён не хаваў непрыязнасці да ахвяр. Але ж маладыя людзі не звярталі на гэта ўвагі. Ці мала хто што гаворыць? Гаварыць можна ўсялякае, гаварыць можа ўсякі. А вось забіваць...

Я пайшла ў суд, каб паглядзець на яго і пашукаць адказаў на пытанне: адкуль бярэцца зло? І не здзівілася б убачыўшы ў клетцы панурага, затурканага, разгубленага маладога чалавека. Зусім не, ясны погляд, не пазбаўлены цікаўнасці да таго, што адбываецца, некаторая нават упэўненасць у сабе. Яна праяўлялася ў кароткіх адказах на пытанні суддзі. Калі ў яго пытаюцца, ці згодзен ён з тым ці іншым выказваннем, дзеяннем, ці няма пытанняў да сведак, ён адказвае хутка, дакладна, выразна. І зусім не пакідае ўражання, што чалавек раскайваецца ў зробленым, хоць апошняе прагучала ў першы дзень суда.

Падсудны скарыстаў сваё права не даваць паказанняў у судзе. Але агучыў зварот, напісаны загадзя: «Сваю віну я прызнаю ў поўным аб'ёме і без якіх-небудзь выключэнняў. Я поўнасцю ўсвядоміў усю цяжкасць і гнюснасць сваіх дзеянняў. Прычынай, што паслужыла здзяйсненню такіх цяжкіх злачынстваў, з'явілася тое, што я трапіў пад уплыў групы людзей, якія распаўсюджваюць у сетцы інтэрнэт шкодніцкую інфармацыю, разлічаную на яшчэ не сфарміраваную свядомасць і мысленне падлеткаў... Я не прашу ва ўсіх прабачэння і не заклікаю да спагады толькі з адной прычыны — я гэтага не заслугоўваю». Нежаданне выступаць у судзе ён растлумачыў «вялікім сорамам, шчырым раскаяннем», а таксама нежаданнем раздражняць пацярпелых «сваёй прысутнасцю і сваім голасам». Прыгожа напісана, але ў шчырасць пакаяння не надта паверыў муж 31-гадовай Сняжаны, якая загінула ад рук забойцы. Яна чакала дзіця, у яе яшчэ засталася 11-гадовая дачка ад першага шлюбу. Пацярпелы — грамадзянін Беларусі, яго жонка з Украіны, яна жыла тут па відзе на жыхарства. Іх у ходзе следства праверылі нават на дачыненне да нарказлачынстваў. Высветлілася, што ні яны, ні члены іх сем'яў гэтай крымінальнай справай не займаліся. Бо падазраваны адразу паведаміў следчым пра свае падазрэнні наконт таго, што муж з жонкай выйшлі з дому, каб прадаць наркотыкі.

Пазней яшчэ ўстанавілі двух цыганоў, якіх ён пакрыўдзіў за два месяцы да таго ў дызель-цягніку Брэст — Лунінец. 17-гадовую дзяўчыну збіў з ног, а яе брата некалькі разоў ударыў. Ён не праходзіў міма людзей, якіх лічыў горшымі за сябе.

Дык хто ж гэты хлопчык прывабнай знешнасці з правільнымі рысамі твару, якога потым назавуць неаязычнікам? Яго сустрэў бы на вуліцы, не тое што спужаўся б, наадварот, звярнуўся па дапамогу, калі б яна спатрэбілася. Ён на выгляд звычайны і чалавечны. Тады хто і калі так выеў яго маладую душу і запоўніў пустое месца нянавісцю? Можа, праблема ў сям'і? Але на суд падтрымаць яго не з'явіліся ні родныя, ні блізкія. А можа, сям'я зусім ні пры чым.

Прадстаўнік пракуратуры доўга высвятляла ў выкладчыцы, якую выхаваўчую работу тая праводзіла і якое пакаранне панесла за гэты выпадак. Куратарка групы разгублена даводзіла, што яна болей увагі ўдзяляла тым, хто дрэнна вучыўся, меў праблемы з паводзінамі. У гэтага ж сапраўды ўсё было добра, амаль узорны навучэнец. Яе работу па выхаванні прызналі нездавальняючай і аб'явілі вымову. Ну і сапраўды, каб яна завезла групу на экскурсію ў Брэсцкую крэпасць, не адбылося б трагедыі? Тут усё глыбей і цяжэй. Калі ён дысцыплінаваны вучань, ён паехаў бы на ўсе экскурсіі: і ў крэпасць, і ў мінскую «Яму», а потым прыехаў бы і пад выглядам Святаслава Ваяводзіна заклікаў бы забіваць. Тут трэба думаць, як у глабальным сэнсе даводзіць да свядомасці юнага пакалення, што галоўная каштоўнасць на свеце чалавек і яго жыццё. З малых дзён даводзіць. Як зрабіць так, каб маладыя глядзелі «Спісак Шындлера» Спілберга і чыталі, напрыклад, «Два браты» Бена Элтана, а не ўсялякую экстрэмісцкую і чарнасоценную лухту? Вядома, трэба гаварыць пра гэтыя і падобныя творы найперш у сям'і, потым у школе.

Гэта забойства, несумненна, стала шокам для ўсяго грамадства. Як адзначала дзяржаўны абвінаваўца на судзе, раней забойстваў па такіх матывах у нас не было. Гэта наогул не характэрна для Беларусі. І суровы прысуд павінен стаць урокам для прыхільнікаў расісцкай ідэалогіі. А для нас усіх папярэджаннем: нельга страчваць пільнасць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Прапановы і цэны

# Білет на «Базар»

Фота БелТА.

**У канцы мінулага тыдня ў Віцебску пачалі прадаваць білеты на канцэрты самага вядомага на постсавецкай прасторы фестывалю. А з 25 лютага білеты даступныя на сайтах і ў касах білетных аператараў kvitki.by і ticketpro.by. Мы пацікавіліся цэнамі відовішчаў.**

Нагадаем, што XXVIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» сёлета пройдзе з 8 да 17 ліпеня.

На цырымонію адкрыцця, 11 ліпеня, можна набыць білет ад 65 да 195 рублёў. Сярод зорак: Валерый Лявонцьеў, Тамара Гвердцытэлі, Стас Міхайлаў, Таццяна Буланава, Аляксандр Панаётаў, ВІА «Самацветы», «Арыэль», Ядвіга Паплаўская, Анатоль Ярмоленка, Ірына Дарафеева, Алёна Ланская ды іншыя.

Канцэрт урачыстага закрыцця 15 ліпеня можна ўбачыць за 45—110 рублёў. Хто выйдзе на сцэну, яшчэ невядома, у дырэкцыі адзначылі, што спіс выступоўцаў будзе даступны ў сярэдзіне сакавіка.

10 ліпеня ў Летнім амфітэатры спяе Стас Міхайлаў. Кошт білетаў — ад 30 да 70 рублёў.

13 ліпеня ў віцебскім Лядовым палацы за 10—48 рублёў можна ўбачыць выступленні дзяржаўнага балета на лёдзе з Санкт-Пецярбурга. У той жа дзень у Летнім амфітэатры — «КВЗ-канцэрт чэмпіёнаў і фіналістаў вышэйшай лігі Міжнароднага саюза КВЗ». Кошт білетаў — ад 20 да 45 рублёў.

Таксама 13 ліпеня ў 22.00 стартуе XXVIII Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2019». У першы дзень выпрабаванняў — «Славянскі хіт». Гледачом можна стаць усяго за 15—45 рублёў.

Па традыцыі на праекты Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» можна набыць падарункавы сертыфікат, які пазней абмяняць на білеты на анансаваныя канцэрты, а таксама на тыя, што стануць вядомыя пазней.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Фітнес-ягады на калгасных палетках

## У Гродзенскім раёне заняліся вырошчваннем ягад годжы

**Пробны гектар заморскага кустарніка высадзіў філіял «Парачанка» Гродзенскага мясакамбіната. Паколькі ў Беларусі прамысловым вырошчваннем ніхто не займаўся, ягадная культура павінна прайсці сертыфікацыю.**

Аб цуда-ягадах ведаюць многія. Зоркі шоу-бізнесу рэкламуюць іх як сродак для пахудзення. І сапраўды, маюць мноства карысных рэчываў. У першую чаргу — вітаміны і мінералы.

Ягады годжы — гэта плады кустарніка дзераза звычайная. Іх яшчэ называюць воўчымі, але яны неядавітыя. Распаўсюджана расліна ў Кітаі. Але культывуюць яе і ў Еўропе.

Кустоўе балгарскай селекцыі гродзенцы закупілі ў Польшчы. Пакуль пасадзілі доследны ўчастак плошчай адзін гектар. Пасля таго як атрымаюць сертыфікат, памеры пашыраць.

— Ідэя заняцца вырошчваннем ягад годжы прыйшла пасля наведвання плантацыі ў польскім Кракаве, — расказвае **дырэктар філіяла «Парачанка» Анатоль КУЖАЛІНАЎ.** — Кліматычныя ўмовы ў нас аднолькавыя, а рэнтабельнасць культуры высокая. Кошт годжы оптам у сырым выглядзе дасягае пяці долараў за кілаграм, у замарожаным — сямі.

Па словах дырэктара, палякі гатовы купляць ягады ў замарожаным стане. У іх ёсць спецыяльныя тэхналогіі для атрымання высушанай сыравіны. У такім стане ягады ідуць на рэалізацыю ў аптэчную сетку з пэўнымі рэкамендацыямі па выкарыстанні. Усе працэсы ліцэнзаваны.

Але гэта пакуль перспектывы. Зараз у гродзенскіх аграрыяў стаіць задача — максімальна захаваць саджанцы, якія былі высаджаны мінулай вясной. За станам зімоўкі і вегетацыяй сочыць аграном гаспадаркі. Для росту раслін патрэбны пэўныя ўмовы — нейтральная глеба і арганічныя ўгнаенні. За год можна зняць да сямі ўраджаяў, бо кустарнікі пладаносяць са жніўня да маразоў.

Што датычыцца ўжывання, ягады годжы можна заліваць кіпнем і настойваць некалькі хвілін, дабаўляць у гарбату альбо проста есці ў сухім выглядзе. Таксама іх выкарыстоўваюць у якасці дабаўкі да салатаў, кладуць у суп альбо кашу, напрыклад у аўсяныя шматкі на сняданак.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Забілі двух пенсіянераў

**Гэта здарылася ў Бярэзінскім раёне. Як мяркуецца, магчымым матывам для забойства быў канфлікт больш чым трохгадовай даўніны.**

Напачатку ў Бярэзінскі РАУС паступіла паведамленне ад брыгады хуткай дапамогі: у адным з дамоў у вёсцы Гаруні былі знойдзены трупы мужчыны і жанчыны. На месца выехалі аператыўнікі. Высветлілася, што забітыя — сямейная пара пенсіянераў. Жанчына была 1952 года нараджэння, мужчына — 1950-га.

Адпрацоўваючы магчымыя версіі здарэння, міліцыянеры асаблівую ўвагу аддавалі кантактам і сувязям загінулых, іх укладу жыцця. Пад падазрэнне трапілі некалькі чалавек, аднак пасля праверкі іх датычнасць да двайнога забойства не пацвердзілася. Але ў праваахоўнікаў усё ж з'явілася зачэпка: інфармацыя пра канфлікт пенсіянераў з адным колішнім вяскоўцам. Ён адбыўся больш чым тры гады таму. Тым не менш была адпрацавана і гэтая версія, якая прынесла свой плён. Пацвердзілася датычнасць да забойства 37-гадовага жыхара Барысаўскага раёна. Як паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама, установлена і меркаваная прычына злачынства — старая крыўда, якая ўсплыла на фоне ап'янення. Падазраваны затрыманы, заведзена крымінальная справа за забойства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ІДЭІ МАЛАДЫХ — ІДЭІ БУДУЧЫНІ

## У бізнес-інкубатары Парка высокіх тэхналогій прайшоў фінал Рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу інавацыйных ідэй

**Цёплыя кнігі, аграробат, самаробны 3D-прынтар, мабільны навігатар для людзей з інваліднасцю... Вось толькі некаторыя з незвычайных распрацовак, што былі прадстаўлены ў фінале конкурсу па прасоўванні маладзёжных ініцыятыў «100 ідэй для Беларусі», які ладзіцца Саюзам моладзі ўжо восьмы раз. На ім не проста выяўляюць пераможцаў, а стараюцца матываваць вынаходцаў і развіваць найлепшыя інавацыйныя ідэі ў энергетыцы, прамысловасці, медыцыне, сельскай гаспадарцы, эканамічнай, сацыяльнай і іншых сферах. Сёлета маладыя інаватары (школьнікі, студэнты, курсанты, рабочая моладзь) падалі каля дзвюх тысяч заявак. Толькі 107 з іх дайшлі да фіналу. Эксперты — навукоўцы, бізнесмены, пераможцы мінулых гадоў — ацэньвалі актуальнасць і навізну ідэй, іх практычную значнасць, а таксама рэальнасць рэалізацыі ідэі, вызначылі 20 пераможцаў, якія прымуць удзел у Рэспубліканскім конкурсе інавацыйных праектаў і маюць шанц атрымаць гранты на іх далейшае развіццё.**

...На выстаўцы — ажыўленне: прысутныя з цікавасцю разглядаюць арыгінальныя вынаходствы ўдзельнікаў, а тыя ў сваю чаргу расказваюць пра карысць сваіх распрацовак. Тут табе і робаты, і лекі, і прысмакі розныя — цяжка вызначыць, куды падысці ў першую чаргу.

КАЛЯ аднаго стэнда — маадэль чалавечай печані, а побач з ёй — медыцынскія прылады. Як расказалі аўтары праекта, студэнты Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта Уладзіслаў Катовіч і Андрэй Валкавыцкі, яго сутнасць заключаецца ў тым, што з дапамогай нізкаінтэнсіўнага лазернага выпраменьвання можна паменшыць пухліну печані ў тры-чатыры разы. Пакуль што гэта адкрыццё эксперыментальнае, даследы праводзіліся на пацуках у лабараторных умовах. Але, як дадалі студэнты, праект ужо пачынае рэалізоўвацца як у вучэбнай, так і ў лячэбнай практыцы.

ДАЛЕЙ — стэнд з прысмакамі. «Гэта згушчоны прадукт на аснове сыроваткі», — гаворыць **супрацоўнік лабараторыі малочных кансерваў Інстытута мяса-малочнай прамысловасці НАН Людміла САКАЛОЎСКАЯ.** Ад звычайнай згушчонкі адрозніваецца тым, што цукру там у два разы менш, а лактозы ўвогуле — у сем разоў. Гэта будзе карысна тым, у каго ёсць частковая непераноснасць малочнага цукру. Ці адрозніваецца тэхналогія прыгатавання? «Яна практычна супадае з традыцыйнай за выключэннем

таго, што неабходна папярэдне падрыхтаваць сыроватку, — тлумачыць суразмоўніца. — Гэта паўнавартасная малочная сыравіна, з якой можна і нават трэба рабіць смачны прадукт. Сыроватка на 15 працэнтаў больш карысная за малако, бо ў ёй утрымліваюцца незаменныя амінакіслоты».

Як тлумачыць Людміла Сакалоўская, у звычайнай згушчонцы — больш за 14 працэнтаў лактозы. Чалавек, у якога ёсць яе непераноснасць, пасля трохчатырох лыжак можа адчуць сябе дрэнна. Удасканалены варыянт, які прадстаўлены сёння, мае менш за 2 працэнты лактозы. Пры гэтым на смак прадукт такі ж. Прадукцыю з павышанай біялагічнай каштоўнасцю ўжо можна знайсці ў прадуктовых крамах, у перспектыве плануецца зрабіць цалкам безлактознае згушчонае малако.

ПРАЕКТАМ з незвычайнай назвай «Хутар Мёбіуса», які стварыў аспірант Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Аляксей Зайцаў, зацікавіліся не толькі работнікі аграпрамысловасці, але і людзі з уласнай гаспадаркай. «Будзь фермерам, не выходзячы з дому» — такая ідэя гэтага праекта. З дапамогай прылады дыстанцыйнага кантролю «SMF — 02», поўнасцю замкнутай і аўтаматычнай, вы можаце літаральна кіраваць сваім зямельным участкам з любога пункта свету! На спецыяльнай мабільнай праграме, якая і кіруе сістэмай, некалькі опцый: збор метыаданых, адсочванне вільготнасці глебы (і, пры неабходнасці, паліў), установка аптымальных умоў для вырошчвання культур, выбар альтэрнатыўнай крыніцы энергіі (дажджавая вада, сонечная энергія), і нават стварэнне бяспекі фермы.

— Ідэя ўзнікла, калі я захацеў заняцца фермерскай гаспадаркай і задаў сабе пытанне: як стаць фермерам, не выходзячы з дому? — расказвае **аўтар ідэі Аляксей ЗАЙЦАЎ.** — І злучыў ІТ-тэхналогіі з фермерствам. Назву прыдумаў, зыходзячы з падабенства з ідэяй вядомай «Пятлі Мёбіуса» — міжнародным сімвалам рэцыркуляцыі... У нас, як і ў астатніх краінах СНД, няма аналагаў такой прылады. Толькі ў ЗША і Японіі. Аднак там — праекты, якія трэба купляць за некалькі сотняў долараў, а змяніць іх і дадаць нешта сваё ты не зможаш. Мой жа — адкрыты для дапаўненняў, а сама прылада каштуе ад 50 рублёў.

**ГАННА ПАЛЕШКА, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН** прадставіла праект, які дазволіць людзям з рэдкімі генетычнымі захворваннямі пазбавіцца ад «дрэнных» клетак. «Нетыповыя хваробы сустракаюцца ў людзей у суадносінах 1 да 2000. За апошнія гады якасць дыягностыкі значна палепшылася, таму важна займацца распрацоўкай «добрай» клетачнай мадэлі для вывучэння патагенезу цяпер».

Суразмоўніца сказала, што пераўтварэнне дарослых перапраграмаваных клетак у эмбрыянальны стан дапамагае стварыць індуцыраваныя клеткі (ствалавыя, створаныя ў лабараторных умовах). А яны дапамагаюць навукоўцам змяніць генетычны складнік чалавека. Адметна, што аналагічных распрацовак у іншых краінах няма, таму гэты праект унікальны.

ПЕРАНОСНЫ і аўтаномны лазерны гравёр Аляксандра Шыдлоўскага і Дзіяны Біруковай з Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта таксама не застаўся без увагі. З дапамогай гэтай прылады для гравіроўкі па дрэве можна ствараць арыгінальныя і непаўторныя сувеніры: фота і паштоўкі на фанеры, «драўляныя» блакноты, настольныя гульні. Сярод асаблівасцяў гравёра — аўтаномнасць, наяўнасць экрана кіравання, назіранне праз камеру і ціхі рэжым работы. Аляксандр і Дзіяна лічаць, што іх прылада можа спатрэбіцца школам, дамам дзіцячай творчасці, рамеснікам і капіцэнтрам.

АДНЫМ з самых людных сярод прадстаўленых быў стэнд з распрацоўкай мабільнай праграмы «Мабільны навігатар для людзей з інваліднасцю «INVO». Прадстаўнікі аўтарскага калектыву навучэнцаў Мінскага радыётэхнічнага каледжа Юлія Стэфняк і Наталля Сусько ўпэўнены, што гэтая праграма прынясе карысць многім людзям: «Мы стараемся зрабіць усё, каб палепшыць безбар'ернае асяроддзе ў нашым горадзе. Сутнасць ідэі заключаецца ў тым, што на электроннай карце змяшчаюцца маршруты, якія маюць адзнакі-колеры: зялёны паказвае той маршрут, дзе можна рухацца, чырвоны — непераадольныя аб'екты і перашкоды, жоўты — тыя, што часткова можна аб'ехаць. Пакуль што гэтая праграма даступная толькі на android, але ў хуткім часе плануецца зрабіць яе і для карыстальнікаў IOS».

А ці зручна будзе карыстацца гаджэтамі старэйшаму пакаленню? «Акрамя мабільнай версіі ёсць і папяровы варыянт, — расказваюць дзяўчаты. — Мы змяшчаем нашы маршруты ў розных медыцынскіх цэнтрах, каб старыя людзі больш ведалі пра магчымасць рухацца па горадзе без перашкод. Разам з валанцёрамі праводзілі апытанне сярод сем'яў, дзе ёсць інвалід, па якім высветлілі, што такія людзі часцей за ўсё баяцца перамяшчацца на вялікую адлегласць з-за розных перашкод. А наш навігатар якраз-такі «асвятляе» ім гэты шлях».

Юля і Наталля кажуць, што ў хуткім часе яны плануюць інтэграваць расклад маршрутаў нізкападлогавага транспарту ў рэальным часе, але пакуль што распісаныя толькі пешыя маршруты: «Мы плануем пастаянна ўносіць змены ў распрацаваную праграму, бо безбар'ернае асяроддзе пастаянна мяняецца. Атрымліваючы зваротную сувязь з нашымі карыстальнікамі, мы можам гарантаваць якасную работу прылады».

ПРЫЦЯГНУЛА ўвагу прысутных і вялікая незразумелая фігура са шчупальцамі. Аказалася, яна раздрукаваная на самаробным 3D-прынтары! Яго змайстраваў з падручных матэрыялаў магістрант Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Сяргей Нікіцін. Асаблівасць вынаходства ў тым, што ў ім ёсць магчымасць замяняць асноўны інструмент на лазерны гравёр ці экструдар (машына для размягчэння) для друку пастай, а таксама хуткасць друку вышэйшая, чым у звычайным прынтары.

